***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў***

Імкнецца мэтанакіравана здзяйсняць праграму фіксацыі, вывучэння, захавання і трансляцыі фальклору ў самым шырокім спектры яго праяў. Кафедра рэжысуры абрадаў і свят (працуе з 1992) рыхтуе студэнтаў па спецыялізацыях «рэжысура народных абрадаў і свят», “рэжысура масавых відовішчаў і свят». Сурацоўнікі кафедры адрадзілі святы «Каляды», «Гуканне вясны», «Юр’е», “Вялікдзень», «Купалле», «Дажынкі», «Кірмаш».

***Крук** Янка (Іван Іванавіч* (н. 15.06.1954, в. Згурск Чэрвеньскага р-на), фалькларыст, культуролаг, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1985). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1976). З 1979 працаваў у Інстытуце мастацтваўзнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі,. У 1998–2003 прарэктар і загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Бел. акадэміі мастацтваў. Даследуе праблемы гісторыі і тэорыі ўсходнсславянскага фальклору, духоўнай культуры бел. народа: паэтыку казачнага эпасу, этнасеміётыку, семантыку абрадаў і сімвалаў нар. культуры. Працус над праблемамі рэканструкцыі міфа-паэтычнай мадэлі свету славянскіх народаў, структураваннем прасторы і ўпарадкаваннем часу, паходжаннем і гісторыяй развіцця нар. летазлічэння, узаемадзеяннем абрадаў сямейна-родавай накіраванасці з рытуальна-абрадавымі комплексамі традыцыйнага календара. Аўтар манаграфій “Следам за Сонцам: Беларускі народны каляндар» (2-е выд., 1998), «Сімволіка беларускай народнай культуры», «Фальклорная спадчына Чэрвеньскага раёна» (усе 2000), «Кола часу: традыцыі і сучаснасць» (2003), «Зімовыя святы» (2004).

Сярод значных прац па тэме іншых супрацоўнікаў:

Калацэй В. В. Экзатэрычныя і эзатэрычныя бакі каляндарных рытуалаў : да пытання тэарэтычнага абгрунтавання методык палявых даследаванняў / Калацэй В. В. // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі : [зборнік] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў", Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. – Мінск, 2008. – С. 57–60.

Матыліцкая Н. З гісторыі даследавання каляндарна-абрадавага фальклору Случчыны / Наталля Матыліцкая // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29–30 красавіка 2009 г.) / [рэдкалегія: М. А. Мажэйка (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 85–86.